# *тэма:* ЛЕТАПІСАННЕ XII - XII стст.

1 *Роля летапісаў у фарміраванні гістарычнай свядомасці грамадства.*

2 *“Аповесць мінулых гадоў” як помнік усходнеславянскага летапісання XII ст.*

3 *“Кіеўскі летапіс” як помнік мясцовага летапісання канца XII ст.*

4 *“Галіцка-Валынскі летапіс” як помнік летапісання XIII ст.*

# *1 Роля летапісаў у фарміраванні гістарычнай свядомасці грамадства.*

- Вялікае значэнне ў фарміраванні і развіцці нацыянальна-гістарычнай самасвядомасці старажытных русаў мела летапісанне, якое грунтавалася 1)на гістарычных паданнях, на 2)паэтычным асэнсаванні народам сваёй гераічнай мінуўшчыны і на 3)дакументальных запісах сучаснікаў пра найбольш значныя гістарычныя падзеі.
- Ужо ў XI ст. гэтыя розныя матэрыялы аб'ядноўваліся ў **летапісныя зводы**, асобныя літаратурныя помнікі, якія захаваліся ў больш позніх гістарычных кампіляцыях.
- Узнікненне летапісання было выклікана да жыцця важнымі ідэйна-палітычнымі задачамі культурна-гістарычнага развіцця ўсходніх славян, ростам іх грамадскай і этнічнай самасвядомасці ў перыяд актыўнага гістарычнага самасцвярджэння.

## *2 “Аповесць мінулых гадоў” як помнік усходнеславянскага летапісання XII ст.*

- Летапіс складзены ў пачатку XII ст.;
- Аўтар – манах Кіева-Пячорскага манастыра **Нестар;**
- Уласна Нестарава **рэдакцыя твора** не захавалася. Твор дайшоў да нашага часу ў шматлікіх рэдакцыях і рукапісных спісах *(найбольш старажытныя – Лаўрэнцьеўскі (1377), Іпацьеўскі (XV ст.), Радзівілаўскі (XV ст*.);
- Прычына напісання – сцвердзіць сваю незалежнасць ад Візантыі праз паэтызацыю ўласнай гісторыі, пераважна хрысціянскага перыяду;
- Асноўны ***змест*** “Аповесці мінулых гадоў” – палітычная гісторыя Старажытнай Русі, гісторыя ўтварэння і развіцця Кіеўскай дзяржавы, выкладзеная паводле гістарычна дакладных даных і фальклорнага матэрыялу.

# *Помнік складаецца з 2-х розных па характары частак:*

1)***Уступнай*** (напісаная як цэласнае звязнае апавяданне пра далёкае мінулае Русі).

- Ва ўступнай частцы расказваецца пра паходжанне славян, рассяленне ўсходнеславянскіх плямён, іх норавы і звычаі.

2) ***Уласна летапісу***, пададзенага ў форме асобных пагадовых датаваных запісаў.

- Датаваная частка летапісу ахоплівае перыяд з 852 да 1110 г. уключна і прысвечана старажытнарускай гісторыі, выкладзенай у храналагічнай паслядоўнасці.

- «*Аповесць мінулых гадоў*» – летапісны **звод**, гістарычна-літаратурная *кампіляцыя*, у якой **зведзены** матэрыялы, узятыя з розных паводле часу, месца паходжання і аўтарскай прыналежнасці твораў:
- ***з візантыйскай хронікі Георгія Амартала*** (звесткі з гісторыі розных плямён і народаў);
- ***з Бібліі*** (звесткі біблейскай гісторыі, цытаты, агульная хрысціянска-багаслоўская канцэпцыя сусветнай гісторыі );
- ***з мясцовых крыніц*** (папярэднія летапісы, тэксты дагавораў кіеўскіх князёў з Візантыяй X ст., жыціі першых старажытнарускіх святых, гістарычныя запісы аўтара зводу).

# Беларуская гісторыя ў летапісе

- У гэтым зводзе захаваліся ўнікальныя звесткі па гісторыі беларускіх гарадоў і зямель;
- у прыватнасці, пра Полацк і Полацкую зямлю, пра першых полацкіх князёў Рагвалода і яго дачку Рагнеду, Брачыслава і яго сына Усяслава Чарадзея, апетага ў «Слове пра паход Ігара».

# ЗНАЧЭННЕ ЛЕТАПІСУ:

- служыў і служыць багатай скарбніцай ведаў пра гісторыю даўняй Русі;
- стымуляваў зараджэнне летапісання ў іншых усходнеславянскіх землях;
- стаў літаратурным узорам і крыніцай для наступных летапісцаў;
- дапамагае атрымаць уяўленне пра гістарычныя веды і светапогляд нашых далёкіх продкаў. (*Гл.с.49 акад. выд.)*

## *3 “Кіеўскі летапіс” як помнік мясцовага летапісання канца XII ст.*

- з’яўляецца працягам «Аповесці мінулых гадоў»;
- складаўся на працягу XII ст.;
- з’яўляецца помнікам пачатку феадальнай раздробленасці;
- як вынік -- засведчыў звужэнне гістарычнага кругагляду летапісцаў таго часу, якія сталі выразнікамі мясцовых інтарэсаў і поглядаў (*іх увага сканцэнтравана амаль выключна на падзеях, што датычацца Кіева і Кіеўскай зямлі, а сам летапіс месцамі пераходзіць у сямейны дзённік кіеўскага князя*).

# Беларуская гісторыя ў летапісе:

- Кіеўскі летапіс захаваў шэраг арыгінальных і вельмі каштоўных звестак па гісторыі Полацкай зямлі.
- Некаторыя з іх (запісы пра падзеі 50-60-х гг. XII ст.) асобныя вучоныя лічаць полацкімі і сваім паходжаннем, бачаць у іх фрагменты згубленага Полацкага летапісу.
- Так, пад 1158 г. у Кіеўскім зводзе змешчана напісанае відавочцам падрабязнае апавяданне пра паўстанне палачан супраць князя Расціслава Глебавіча і вяртанне ў Полацк пасля пяцігадовага выгнання князя Рагвалода Барысавіча. *(Гл.с.78-80 акад. выд.)*

## *4 “Галіцка-Валынскі летапіс” як помнік летапісання XIII ст.*

- апошні выдатны летапісны помнік **агульнага, старажытнарускага** этапу ў гісторыі ўсходніх славян;
- храналагічна працягвае Кіеўскі і ахоплівае перыяд з 1201 да 1292 гг.;
- прысвечаны пераважна гісторыі Галіцка-Валынскай Русі, апісанню яе ўнутрыпалітычнага жыцця і міжнародных узаемасувязей, барацьбы з Польшчай і Літвой, з татарамі і ятвягамі і інш.

# Складаецца з дзвюх асноўных частак – **Галіцкага** і **Валынскага** летапісаў

- **Галіцкі** летапіс – створаны паміж 1256-1258 гг.;
- адметнасць – у першапачатковым варыянце *адсутнічала пагадовая* сетка;
- вылучаецца свецкім характарам, высокай культурай і літаратурным майстэрствам гістарычнага апавядання, багаццем вобразна-паэтычнай мовы;
- Галоўны герой – князь Даніла Раманавіч Галіцкі – высакародны і смелы воін, моцны і мудры правіцель, усе ўчынкі якога накіраваны на ўмацаванне княства.

- **Валынскі** летапіс – створаны ў 90-х гадах XIII ст.;
- пагадовая сетка ў ім таксама адсутнічала, але выкладанне было падпарадкавана строгай храналагічнай паслядоўнасці падзей;
- мае мясцовы характар, вызначаецца лаканічнай непасрэднасцю апавядання, часам хвалюючымі падрабязнасцямі і мастацкай непаўторнасцю асобных эпізодаў.

# Беларуская гісторыя ў летапісе

- Галіцка-Валынскі летапіс захаваў унікальныя звесткі аб палітычнай гісторыі сярэдневяковай Літвы і Беларусі:
- пра час першапачатковага станаўлення на іх землях новай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага;
- пра жыццё і дзейнасць яго першых князёў Міндоўга, Войшалка, Тройдзеня і інш.;
- па гісторыі Навагрудка, Гродна, Турава, Пінска, Брэста, Ваўкавыска, Слоніма і інш. бел-х гарадоў.
- л-с паслужыў літаратурным узорам і непасрэднай крыніцай беларуска-літоўскіх летапісаў XVI ст. «Хронікі ВкЛ і Жамойцкага» і «Хронікі Быхаўца».